# СА СТУДЭНЦКІМ ЗАПАЛАМ І НАПОРЫСТАСЦЮ



*Франц Пяткевіч, студэнт 2 курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры, працуе фурманам. Гэтая праца прыйшлася яму па густу.*

Фота Л. Кузьміцкага.

(Пачатак на 1 стар.)

данцкай службы», які прыязджае заўсёды з поўным вазком.

— «Выпісвай колькі хочаш», — гаворыць мне галоўны бухгалтар. Я, вядома, так і раблю. Апетыт пасля работы заўсёды добры. Баюся, пры разліку можа і стыпендыі не хапіць, — смяецца Гулько.

## Гавораць, вясёлы смех—здароўе,

а смех, ды яшчэ з трапнымі жартамі, дружнымі песнямі, страснай палемічнай перастрэлкай — пастаянны спадарожнік універсітэцкіх дзяўчат і юнакоў. З імі і працаваць лягчэй і спарней. Тады любая праца, любая задума па плячу. Прыехалі дзяўчаты 2 курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры ў саўгас «Бальшавік», а начальства ім і кажа: «Не ведаем, ці накапаеце вы ў нас. Летась студэнты дык наогул не капалі бульбы, працавалі на іншых работах». Надзя Коўш, Валя Красоўская, Ліда Прамковіч, Марыя Кулік рашуча заявілі: «Мы не з таго дзесятка, капаць бульбу не баімся».

Заедзьце цяпер да студэнтак, і вы ўбачыце, як, расцягнуўшыся ланцужком, ідзе ў наступленне 2 курс. Адстаючых няма. Кожная студэнтка накопвае за дзень па 3,5 — 4 цэнтнеры клубняў, хоць ураджай сёлета не надта добры. Вясёлы смех — памочнік у іх рабоце, паказчык іх бадзёрасці.

## „Прэтэнзій не маю!—

так сказаў аб рабоце юрыстаў 2 курса брыгадзір саўгаса «Буцэвічы» Сяргей Іванавіч Тарасік. —У параўнанні з медыкамі, якія працавалі ў нас вясной на прапалцы кукурузы, юрысты працуюць выдатна». З іх дапамогай мы заканчваем абмалот ільну, збожжавых. Хочацца асабліва адзначыць Уладзіміра Тапурку, Валю Раковіч, Алега Краўчанку. Яны выдатныя арганізатары і запявалы ў сваёй групе».



*Дружна і зладжана ідзе праца на бульбяных палетках саўгаса «Барадзяны». Адну за адной высыпаюць дзяўчаты кошыкі з буйнымі клубнямі. Толькі паспявай адвозіць. На здымку: студэнткі 2 курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры на ўборцы бульбы.*

Фота Л. Кузьміцкага.

## Валерый танцуе польку

Наступіў суботні вечар. Куды ж пайсці? У Казекава ж няма нават клуба. Вось дык трапілі! Трывозе юрыстаў паклаў канец брыгадзір: «Па вас прыйшла машына. У суседняй вёсцы — вечар адпачынку».

Пасля канцэрга зайграла музыка. Закружыліся пары. Застаўся стаяць адзін Валерый Мітрафанаў: такі сканфужаны, мнецца, азіраецца. Іграюць беларускую народную польку, а ён не ўмее танцаваць. Параіліся сябры, трэба выручаць таварыша. І падыйшла да студэнта вясковая дзяўчына.

— Дазвольце запрасіць Вас.

— Ды я, ведаеце, не ўмею..

— Нічога, я буду вучыць..

Цяпер Валерый так танцуе польку, быццам займаўся дзе-небудзь у танцавальным гуртку.

Кіраўніцтва саўгаса забяспечвае юрыстаў транспартам для паездак на вечары адпачынку. У сваю чаргу, студэнты падрыхтавалі канцэрт для сельскіх працаўнікоў. У дружбе і цесным кантакце з рабочымі саўгаса жывуць студэнты. У «Вішнёўцы» ў распараджэнне студэнтаў выдзелен тэлевізар, у «Бальшавіку» — магнітафон.



*Студэнты-юрысты былі занятыя ў гэты дзень на ўборцы ячменю. На здымку: другакурсніца Тамара Васільева на ніве саўгаса «Буцэвічы».*

Фота Л. Кузьміцкага.

Мы запыталіся ў другакурснікаў аддзялення рускай мовы і літаратуры, як яны праводзяць вольны ад работы час. І Ольга Іпатава адказала:

— Сумаваць не прыходзіцца. Кожны вечар ходзім у клуб на танцы, у кіно і г. д.

Ларыса Сафронава дадае:

— Нам вельмі добра, весела. Жывём дружна. Усім задаволены.

Студэнты не забываюць аб кнізе, вучобе. Кожны набраў з сабой падручнікаў, літаратуры. Наладжваюць дыспуты, сумесна абмяркоўваюць прачытанае. І тут, у саўгасах, студэнцкае жыццё струменіць сваім прывычным, творчым.

* * *

З саўгасаў паступаюць радасныя весткі. Студэнты паспяхова дапамагаюць сельскім працаўнікам у своечасовым заканчэнні палявых работ чацвёртага года сямігодкі.

Аляксей ЖУК

(Пачатак на 1 стар.)

гэта ў валейбол гулялі «першая каманда» і «дублёры». «Балець» за «дублёраў» прыходзіў сам дырэктар біёлага-геаграфічнай станцыі Яўгеній Адамавіч. Ды і «дублёры» — гэта каманда, якая ўстала пад сцягам Ігара Ляскоўскага, а «майстры» — каманда лепшага валейбаліста курса Барыса Яшчанкі...

На курсе большасць дзяўчат, і яны не давяралі кухню хлопцам. Казалі, ваша справа забяспечыць вадой і дровамі. Гатавала ежу кожная брыгада паасобку. Сядзелі за абедамі таксама кожная брыгада за сваім сталом. Нярэдка можна было пачуць, што, маўляў, у нас смачней, а ў вас — не.

Аднойчы дзяўчаты вырашылі ўстроіць сабе выдахны дзень. У кожнай брыгадзе выдзялілі дзяжурных. Сабраліся восем юнакоў на кухне і засумавалі. Што рабіць? Што будзем гатаваць? Доўга раіліся і рашылі—не падкачаць!

Ледзь рассвяло, усталі хлопцы, прыгатавалі снеданне, здзівілі сталы, расставілі ежу. Паклікалі астатніх снедаць. Усе заходзілі і.. здзіўляліся, не ведалі, куды сесць. Паснедалі і тут жа вынеслі рашэнне: малайцы, рабяты; з гэтага дня ўсё будзе агульнае.

# МАНАЛІТ

Мензульныя здымкі закончылі. Акуратна вычарцілі карты. Прыйшоў дзень здачы заліку па геадэзіі. Да ўсеагульнага задавальнення, усе работы былі выкананы выдатна. Не менш, чым студэнты, вынікамі практыкі былі задаволены Віктар Якаўлевіч і Расціслаў Афанасьевіч..

З пачаткам практыкі па метэаралогіі прыйшло дрэннае надвор'е. Цікавая гэта навука — метэаралогія. Яна вывучае і растлумачвае фізічныя з'явы і працэсы, якія адбываюцца ў атмасферы пры ўзаемадзеянні яе з падсцілаючай паверхняю.

Кіраўнік практыкі Сідар Сафронавіч Коўшэр прывёз і раздаў прыборы. Днём і ноччу дзяжурылі пазменна географы ля прыбораў...

Сонечнай раніцою прыехаў Уладзімір Уладзіміравіч Стэцко, кіраўнік практыкі па глебазнаўстве. На лінейцы ён аб'явіў задачы палявога даследавання глебаў. Цяжкая практыка па глебазнаўстве, тым больш, што хлопцаў на курсе мала. А трэба на ўчастках выкапаць па 18—20 шурфаў! Закіпела работа. І зноў наперадзе брыгада Васіля Пахучага. У брыгадзе ёсць сакрэт, і яна імкнецца выканаць работу яшчэ хутчэй.

Нарэшце, сакрэт раскрываецца. На біёлага-геаграфічнай станцыі—вяселле. Радасна сустракаюць усе віноўнікаў урачыстасцей Алу Іванову і Васіля Пахучага. Ад усёй душы віншуюць іх аднакурснікі.

..Яшчэ больш дружным стаў калектыў. Як многа дае самастойнае жыццё на студэнцкіх практыках! Як раскрывае душу чалавек! Радасна бачыць, як спорыцца праца. Так, гэта ўжо сапраўдны калектыў, згуртаваны, як маналіт. І ў дружбе яму яшчэ не адзін годісці!

...Абветраныя, загарэлыя, з песнямі, як сапраўдныя геолагі, пакінулі першакурснікі Краснае Урочышча. Геалагічная практыка праходзіць на берагах Заходняй Дзвіны, у гарадскім пасёлку Руба. Жылі ў палатачным гарадку не беразе. З геалагічнымі малаткамі ланцужком лазілі па кар'ерах і беразе ракі. Брэлі абразцы вапнавых даламітаў. Вялі дзённікі. Разам ездзілі на экскурсію ў Віцебск.

Нарэшце, практыка закончылася. Засумавалі пры развітанні дзяўчаты. Моцныя рукапажацці. Галасы: «Шчаслівай дарогі! Да пабачэння!..». Да пабачэння, сябры!

Ігар ЛЯСКОЎСКІ.

## УСЮДЫ—65

*Перастаўце лічбы так, каб сумы ў гарызантальных і вертыкальных радках, а таксама па дыяганалях былі роўныя 65. Разам з лічбамі перастаўляйце адпаведныя літары. Тады вы прачытаеце беларускую прыказку. Падкажам, што ў левы верхні куток трэба паставіць лічбу 11.*

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 1 це | 2 д | 3 да | 4 н | 5 т |
| 6 б | 7 ў | 8 о | 9 ш | 10 ча |
| 11 Д | 12 а | 13 а | 14 і | 15 а. |
| 16 д | 17 а, | 18 с | 19 о | 20 ла |
| 21 м | 22 св | 23 а | 24 зе | 25 р |

Склаў *В. НАЛІМАЎ.*

Рэдактар У. КУЛАЖАНКА.


## Падпісвайцеся на часопіс „Филологические науки“

Часопіс знаёміць з навейшымі кірункамі ў галіне мовазнаўства і літаратуразнаўства, з навуковым і педагагічным жыццём кафедр моваў і літаратур універсітэтаў і педагагічных інстытутаў, друкуе хроніку міжвузаўскіх нарад і міжнародных калёквіумаў, артыкулы па пытаннях выкладання ў вышэйшай школе моваў і літаратур, а таксама матэрыялы і паведамленні, публікацыі і дакументы, крытыку і бібліяграфію.

Перыядычнасць часопіса—4 нумары ў год. Цана нумара — 1 рубель.

Пры падпісцы спасылайцеся на каталог — індэкс 698.

Падпіска прымаецца пунктамі «Саюздруку», на паштамтах, у кантэрах і аддзяленнях сувязі, грамадскімі распаўсюджвальнікамі друку.


Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэлефон 2-07-19. Друкарня Белсаўпрофа. Зак. 2813 АТ 15306.